# Повязь і знітаванасць



Людміла Пятруль. "Галава сялянскай дзяўчыны". Рэмэйк карціны К.Малевіча. 2008 г.

Для гэтай выставы, якая адкрылася надоечы ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", здаецца, і немагчыма было б прыдумаць назву лепшую, чым гэтая — "Повязь". Повязь нітак у розных плоскасных і прасторавых структурах, повязь традыцый народнага ручнога ткацтва і тэматычных каралеўскіх шпалер, повязь жывапісу і тэкстыльных тэхнік, повязь стагоддзяў (у 70-я гады мінулага стагоддзя беларускі габелен нараджаўся як самадастатковы від мастацтва нароўні з жывапісам і графікай, тады ж сфарміравалася і ўласнабеларуская школа сучаснага габелена, а сёння ўжо можна назіраць трансфармацыю габелена ў тэкстыльны дызайн), нарэшце, повязь пакаленняў праз перадачу ведаў, асабістых пошукаў у тэкстыльным мастацтве і любові да яго. І цяжка адразу вызначыць, чым найбольш палоніць гэтая экспазіцыя, дзе прадстаўлены работы выдатнага майстра жывога класіка габелена Людмілы Пятруль і яе вучняў-паслядоўнікаў — сённяшніх маладых мастакоў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Так бы мовіць, звычайнай незвычайнай прыгажосцю, якая заўсёды так радуе вока? Сімвалічнасцю, філасафічнасцю вобразаў? Магнетызмам канкрэтнага віду мастацтва? А, можа быць, нейкай адмысловай панадчасавасцю? У дачыненні да самой Людмілы Пятруль гэта, канечне, рэтраспектыва. Але чамусьці зусім не адчуваеш "мінуласці" такіх яе твораў, як "Муза" (1971), "Памяці дзядоў маіх" (1977), работы з серыі "Сказ пра бульбу" (1982—1983), "Сугучнасць" (1988)... Творы ж апошніх гадоў ("Асенні ўлоў", "Апокрыф", "Гукі памяці", рэмэйкі карцін Шагала і Малевіча) толькі ўзмацняюць незвычайнае адчуванне вяртання ў будучыню — непазбежна шчаслівую, наканаваную дзесяцігоддзямі работы на вытворчасці, у Беларускай акадэміі мастацтваў, у дзіцячых мастацкіх школах... Яркія габелены яе вучняў, выкананыя пад яе непасрэдным кіраўніцтвам, неаднойчы прэзентаваліся на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і займалі прызавыя месцы. Яна заўсёды шчыра радавалася і працягвае радавацца поспехам сваіх творчых спадкаемцаў, а яны ў сваю чаргу плоцяць ёй і беларускаму габелену самым галоўным — не перарываюць повязь.

ISSN 1994-9146